12 (185)
снежань

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

Заснавальнікі:

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Пачатковая школа», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

Рэдакцыйная калегія:
Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

Рэдакцыйная рада:
Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

Рэдакцыя:
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ

Любоў Уладыкоўская, Валерый Шалатонін — Беларус, чалавек Сусвету: Георгій Лахоўскі 5

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Пётр Дарашчонак — Першае выданне для беларускіх жанчын: часопіс "Алеся" ў 1924—1930 гг. 12

ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ

Зарына Канапацкая — Палкоўнік Гасан Канапацкі — камандуючы беларускім войскам 18



Аляксандр КОРЗЮК

ВЫКАРЫСТАННЕ ВУСНЫХ КРЫНІЦ ПРЫ НАВУЧАННІ ГІСТОРЫІ

На працягу XIX—XX стст. метадысты і настаўнікі гісторыі распрацоўвалі прыёмы вучэбнай работы вучняў пераважна з пісьмовымі гістарычнымі крыніцамі. Вусныя крыніцы да пачатку XXI ст. не прыцягвалі спецыяльнай увагі педагогаў, як правіла, з-за таго, што пісьмовая традыцыя мае больш значны аўтарытэт, вусныя гістарычныя сведчанні носяць суб'ектыўны характар, а настаўнік і вучні могуць быць не падрыхтаваныя да іх крытычнага асэнсавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вусная гісторыя і гістарычныя крыніцы вуснага паходжання

Навучанне гісторыі ў сярэдняй школе грунтуецца на сістэматычным выкарыстанні вучэбных гістарычных тэкстаў, прадстаўленых, як правіла, тэкстам вучэбных дапаможнікаў і фрагментамі пісьмовых гістарычных крыніц. Разам з традыцыйным выкарыстаннем дакументальнага матэрыялу ў сучасным адукацыйным працэсе па гісторыі ўсё большая ўвага надаецца ***вусным гістарычным крыніцам***. Факт іх адсутнасці ў многіх класіфікацыях у метадычнай літаратуры тлумачыцца як шматвяковым аўтарытэтам пісьмовай традыцыі, так і арыентацыяй гісторыкаў на пераважнае выкарыстанне пісьмовых крыніц, якія заслугоўваюць, з іх пункту гледжання, большага даверу[1]. У той жа час у сучаснай гістарычнай навуцы вусныя сведчанні разглядаюцца як неабходная крыніца для вывучэння "жывой гісторыі" XX ст. (краязнаўства, штодзённай гісторыі, гісторыі дзяцінства, сямейнай гісторыі і г. д.)[2].

Адзначым, што гэты від крыніц як асобная група вылучаецца толькі ў некаторых *класіфікацыях*:

- у класіфікацыі крыніц па прынцыпе захоўвання і кадзіроўкі інфармацыі (Л.М.Пушкароў)[3];
- у класіфікацыі па метадах і формах адлюстравання рэчаіснасці (І.Д.Кавальчанка)[4];
- у класіфікацыі крыніц па спосабе перадачы інфармацыі (С.О.Шмідт)[5];
- ва ўдакладненай класіфікацыі крыніц па метадах і формах адлюстравання рэчаіснасці (А.М.Нечухрын, У.Н.Сідарцоў)[6].

У першай класіфікацыі яны называюцца "вуснымі", у другой — "фанетычнымі", у трэцяй — "славеснымі", у чацвёртай — аднесены да фаніч-

КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.

Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар каля 150 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку дапаможнікаў "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (Мн., 2005), "Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе" (Мн., 2010, 2011), "Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу на ўроках гісторыі і грамадазнаўства" (у сааўт., Мн., 2012), "Уроки по учебному предмету "История Беларуси" в 6 классе" (Мн., 2014); "Уроки по учебному предмету "История Беларуси" в 8 классе" (Мн., 2014), "Гістарычнае краязнаўства Беларусі" (у сааўт., Гродна, 2014); вучэбна-метадычнага комплексу факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (у сааўт., Мн., 2010).

ных. Пры гэтым варта ўлічваць, што вусныя крыніцы могуць быць прадстаўлены як у пісьмовай, так і ў аўдыёвізуальнай форме.

Нягледзячы на тое, што выкарыстанне гісторыкамі інтэрв'ю як метада збору вуснай інфармацыі мае даўнія традыцыі, вусная гісторыя з'яўляецца параўнальна маладым накірункам. Самастойны метадалагічны кірунак, які ўзнаўляе гістарычную рэчаіснасць на аснове вусных крыніц і атрымаў назву "***вусная гісторыя***", пачаў фарміравацца пасля Другой сусветнай вайны ў ЗША і Вялікабрытаніі. Яго з'яўленне было абумоўленае метадалагічнымі пошукамі ў заходняй гістарыяграфіі XX ст., якая знаходзілася пад уплывам філасофіі экзістэнцыялізму, постмадэрнізму і традыцый сацыяльнай гісторыі. У гэтым рэчышчы вусная гісторыя бачылася адным з перспектыўных накірункаў гістарычнай навукі, што дазволіла б ёй застацца "навукай аб чалавеку". Другім фактарам стала хуткае развіццё гуказапісваючай апаратуры, якая дазваляла весці збор, апрацоўку і ўзнаўленне вуснагістарычных крыніц.

У адпаведнасці з перыядызацыяй, прапанаванай расійскім гісторыкам І.Б.Арловым, у *развіцці вуснай гісторыі на Захадзе можна выдзеліць некалькі этапаў*[7]:

1. 1950-я — другая палова 1960-х гг. — збор матэрыялаў для стварэння біяграфій выдатных грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў.

2. Канец 1960-х — першая палова 1970-х гг. — спробы стварэння альтэрнатыўнай гісторыі, "гісторыі народаў без гісторыі" народы, якія не мелі ўласнага пісьменства.

3. Сярэдзіна 1970-х — канец 1980-х гг. — пераход ад індывідуальных даследаванняў да стварэння калектыўных праектаў. У гэты час адбываецца інстытуцыяналізацыя вуснай гісторыі: ствараюцца Міжнародны камітэт вуснай гісторыі і нацыянальныя асацыяцыі даследчыкаў, збіраюцца архівы вусных крыніц, ладзяцца навуковыя канферэнцыі, пачынаецца выданне спецыялізаваных часопісаў.

4. 1990-я гг. — пачатак XXI ст. — пашырэнне кола вывучаемых праблем, сярод якіх штодзённае жыццё чалавека, феномен міграцый, асаблівасці этнічнай гісторыі народаў, узаемаадносіны полаў і ўзростаў і інш.

Класічныя работы па развіцці вуснай гісторыі былі напісаныя англійскім гісторыкам *П.Томпсанам*, бельгійскім навукоўцам *Я.Вансінам*, італьянскім даследчыкам *А.Партэлі*[8]. *"З дапамогай вуснай гісторыі, — адзначаў П.Томпсан, — мы пазнаем людзей такімі, якімі яны самі ўяўляюць сябе, мы бачым рэчы (канкрэтныя прадметы, падзеі, месцы) праз унутранае светаўспрыманне кожнага чалавека як непасрэднага ўдзельніка гістарычнага працэсу"*[9].

У СССР вусныя гістарычныя сведчанні актыўна збіраліся пачынаючы з 1920-х гг. для вывучэння гісторыі рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Гэтая практыка знайшла свой працяг у зборы ўспамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, у стварэнні гісторыі прадпрыемстваў і калгасаў. Аднак, на думку расійскага вучонага С.О.Шмідта, дадзеныя факты не дазваляюць у поўнай меры судзіць аб развіцці менавіта вуснай гісторыі, бо пры рабоце з рэспандэнтамі пераважала ўстаноўка на атрыманне дакладных адказаў на дакладныя пытанні, што супярэчыць прыродзе вусных крыніц. Акрамя таго, вусныя сведчанні ўдзельнікаў або відавочцаў падзей, зафіксаваныя пры дапамозе сучасных тэхнічных прыёмаў і сродкаў, з'яўляюцца дасягненнем толькі апошніх дзесяцігоддзяў[10].

З канца 1990-х гг. значны ўклад у развіццё вуснай гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь унеслі навукоўцы У.Н.Сідарцоў, А.Ф.Смалянчук, К.І.Козак, І.М.Раманава, І.С.Махоўская. Аднак у айчыннай навуковай літаратуры канстатуецца, што гэты напрамак у галіне гістарычных даследаванняў на сённяшні дзень не стаў прыярытэтным і ў асноўным з'яўляецца справай энтузіястаў, хаця ўсё больш актуальнай прызнаецца неабходнасць разгляду вуснай гісторыі як асобай сферы навуковых даследаванняў, якая прадстаўляе разнастайныя шляхі і прыёмы аналізу і інтэрпрэтацыі тэкстаў[11].

Паколькі на сённяшні час паняцце "вусная гісторыя" часта ўжываецца ў галіне гуманітарных ведаў, існуе дастаткова шырокі дыяпазон яго інтэрпрэтацый. З пункту гледжання дыдактыкі вусную гісторыю можна вызначыць *як даследчыцкі метад навучання, з дапамогай якога вучань, які выступае ў пазіцыі даследчыка, атрымлівае новыя веды з вусных паведамленняў (сведчанняў) людзей, якія былі ўдзельнікамі ці сведкамі канкрэтнай гістарычнай падзеі*[12]. Запісаныя на аўдыё- і (ці) відэастужку ўспаміны аб падзеях мінулага іх відавочцаў або ўдзельнікаў уяўляюць сабой ***гістарычную крыніцу вуснага паходжання***.

Значэнне вусных гістарычных крыніц для вывучэння гісторыі і іх асаблівасці

Вусная гісторыя робіць магчымым выкарыстанне новых крыніц — *звестак асабістага паходжання*, якія раней не былі даследаваны і якія немагчыма атрымаць іншым шляхам. Яна дазваляе захаваць сведчанні непасрэдных удзельнікаў гістарычных падзей, простых, "маленькіх", людзей, чый жыццёвы вопыт не быў апісаны ў пісьмовых гістарычных крыніцах. Акрамя сведчанняў пра падзеі асабістай і "вялікай" гісторыі ўсе групы вусных крыніц адлюстроўваюць таксама духоўны свет чалавека, яго каштоўнасці, тра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дыцыі, стэрэатыпы, страхі, надзеі, дазваляюць знайсці адказы на пытанні пра асаблівасці светапогляду людзей. Усё гэта дапамагае ўключыць сацыяльна-гістарычны вопыт індывідаў у вывучэнне грамадскіх і агульнакультурных працэсаў.

Выкарыстанне вуснагістарычных крыніц дазваляе скарэктаваць дадзеныя, якія ўтрымліваюцца ў архіўных матэрыялах, стварыць больш поўную і дакладную гісторыю. Мінулае, увасобленае ў гуку і відарысе, дае рэальную магчымасць адчуць прыгажосць і багацце вуснай апавядальнай і бытавой мовы, з'яўляецца матэрыялам для іншых галін сацыягуманітарных ведаў, фарміруе ўсведамленне, што гісторыя ствараецца самімі людзьмі, дае магчымасці для новых накірункаў даследаванняў.

Вусныя крыніцы, з'яўляючыся адным з відаў гістарычных крыніц, могуць быць розных відаў і мець свае тыпалагічныя асаблівасці. Разнастайныя вусныя гістарычныя крыніцы можна падзяліць на тры групы[13]:

- *крыніцы, якія адлюстроўваюць індывідуальную гістарычную памяць* (сведчанні ўдзельнікаў і сучаснікаў падзей, іх бліжэйшых нашчадкаў);

- *крыніцы, якія адлюстроўваюць групавую, калектыўную памяць* (сямейныя паданні, легенды, гарадскія чуткі і г. д.);

- *крыніцы, якія адлюстроўваюць грамадскую, агульнанародную памяць* (гістарычныя песні, гераічны эпас і г. д.).

Кожная група вусных крыніц адрозніваецца зместам гістарычных звестак і сваім прызначэннем, дапамагаючы найбольш поўна вывучыць які-небудзь аспект жыцця грамадства. Разам з тым можна вылучыць наступныя ***агульныя асаблівасці вусных гістарычных крыніц***[14]:

1. *Суб'ектыўнасць, абумоўленая светапоглядным ўстаноўкамі расказчыкаў*, іх сацыяльным вопытам, ступенню ўдзелу ў пэўнай гістарычнай падзеі, рэлігійнай прыналежнасцю і іншымі фактарамі. Пры гэтым суб'ектыўнасць вуснай гістарычнай крыніцы можа разглядацца як яе перавага, бо даследчыку (у тым ліку школьніку) важна зразумець механізм адлюстравання гістарычнай рэальнасці ў індывідуальнай свядомасці.

2. *Складанасць устанаўлення ступені дакладнасці*. Дадзеная праблема ўзнікае тады, калі вусныя крыніцы выкарыстоўваюцца для рэканструкцыі мінулага (дзейнасці, перажыванняў, пачуццяў людзей у канкрэтны гістарычны момант). Аднак калі рэканструіруюцца індывідуальныя або калектыўныя інтэрпрэтацыі гісторыі, то праблема ступені дакладнасці вусных сведчанняў губляе сэнс.

3. *Інфармацыйная шматслойнасць*. Інтанацыі, агаворкі, міміка, жэсты, якія суправаджаюць вуснае паведамленне, не толькі істотна дапаўняюць гістарычную інфармацыю, але і самі з'яўляюцца крыніцамі інфармацыі аб стаўленні таго, хто гаворыць, да прадмета свайго выказвання.

4. *Дваістая прырода*. Вусная крыніца нараджаецца ў выніку дыялогу дзвюх асобаў: відавочцы-апавядальніка і чалавека, які фіксуе яго ўспаміны і таксама ў некаторай ступені ўплывае на працэс успамінаў.

5. *Праблема так званых "матрычных тэкстаў"*, калі рэспандэнт выдае за свае думкі ці асабістыя сведчанні стандартны ці нават афіцыйны тэкст, які ён засвоіў і лічыць уласнай пазіцыяй.

6. *Накладанне пэўных гендэрных, этнічных, палітычных праблем*, або "ментарскага аспекту" на вусныя сведчанні, якія пажадана ненадакучліва змякчаць падчас інтэрв'ю або гутаркі.

Такім чынам, вусныя гістарычныя крыніцы з'яўляюцца незаменнай асновай для вывучэння сканструяваных у свядомасці відавочцаў і іх нашчадкаў вобразаў вывучаемай гістарычнай падзеі.

Статус вусных гістарычных крыніц у школьным навучанні гісторыі на сённяшні дзень у пэўнай ступені змяніўся. Аб узрастанні цікавасці да іх з боку школьнікаў і настаўнікаў сведчыць рост колькасці даследчых работ з іх выкарыстаннем і прадстаўленых на вучнёўскіх навукова-практычных канферэнцыях. Такая ўвага да вуснай гісторыі можа тлумачыцца тым, што яе сведчанні з'яўляюцца незаменнымі пры вывучэнні сямейнай гісторыі, біяграфій асобных людзей, а таксама ў гістарычным краязнаўстве пры апісанні канкрэтных аб'ектаў або падзей іх удзельнікамі, відавочцамі або сучаснікамі.

Сярод найбольш *тыповых недахопаў і цяжкасцяў*, з якімі сутыкаюцца вучні пры рабоце з дадзенымі крыніцамі, метадысты называюць наступныя[15]. Большасць школьнікаў ставяцца да вуснага сведчання пераважна як да ілюстрацыі: вусная крыніца цытуецца ў 90—95% работ, а суадносіцца яна з біяграфіяй апавядальніка і гістарычнай эпохай, каментуецца і інтэрпрэтуецца — толькі ў 20—50% работ. Крытычнае стаўленне да вусных гістарычных сведчанняў прасочваецца ў работах толькі 15% удзельнікаў канферэнцый. Такім чынам, у рамках дзейнаснага падыходу да навучання гісторыі ўяўляецца актуальным авалоданне вучнямі прыёмамі работы з гэтым тыпам гістарычных крыніц.

Прыёмы работы з вуснымі гістарычнымі крыніцамі

Распрацоўка метадычных прыёмаў работы з вуснымі гістарычнымі крыніцамі ажыццяўляецца ў рэчышчы ***дзейнаснага падыходу да навучання прадмету***. Спосабы вучэбнай дзейнасці з гістарычным матэрыялам праяўляюцца ў прыёмах вучэбнай работы — канкрэтных сумесных дзеяннях настаўніка і вучняў, накіраваных на рашэнне кан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

крэтнай задачы навучання. Кожны прыём уключае ў сябе пэўныя дзеянні і аперацыі. Для ажыццяўлення прыёму вучні павінны ведаць спосаб дзеяння і ўмець прымяніць гэты спосаб на практыцы. Такім чынам, у працэсе навучання яны засвойваюць веды аб тым, што і як рабіць (арыенціровачную аснову дзейнасці), і ўжываюць іх на практыцы.

Вучэбна-пазнавальная работа вучняў з вуснымі гістарычнымі крыніцамі адрозніваецца ад вывучэння іншых крыніц, паколькі амаль заўсёды прадугледжвае *дадатковы этап* — стварэнне вусных крыніц, які папярэднічае іх вывучэнню. У адпаведнасці з гэтым палажэннем вылучаюцца дзве групы прыёмаў работы з вуснымі гістарычнымі крыніцамі[16]:

I. *Прыёмы стварэння вусных крыніц* (уключаюць прыёмы збору і фіксацыі матэрыялаў: інтэрв'ю, гутарку і назіранне).

II. *Прыёмы вывучэння вусных крыніц* (уключаюць прачытанне, расшыфроўку, каментаванне і інтэрпрэтацыю сабраных матэрыялаў).

I. Збор і фіксацыя гістарычных сведчанняў.

На этапе стварэння вуснай крыніцы збор гістарычных сведчанняў ажыццяўляецца з дапамогай інтэрв'ю, гутаркі і назірання. Самым распаўсюджаным спосабам збору вуснай інфармацыі з'яўляецца **інтэрв'ю** — сукупнасць пытанняў, адказы на якія ўтрымліваюць неабходную даследчыку інфармацыю. Інтэрв'ю можа быць калектыўным (накіравана на выяўленне грамадскага або групавога меркавання па тым ці іншым пытанні) і індывідуальным (дазваляе выявіць асабістую думку апытанага). Даследчык, які арганізуе і праводзіць інтэрв'ю, называецца *інтэрв'юерам (карэспандэнтам)*, а чалавек, у якога бяруць інтэрв'ю, — *інфармантам (рэспандэнтам)*.

Для правядзення інтэрв'ю і фіксацыі яго вынікаў мэтазгодна рэкамендаваць школьнікам выкарыстоўваць карткі-апытальнікі (далей — апытальнікі). На пачатковым этапе засваення прыёмаў стварэння вусных гістарычных крыніц яны з'яўляюцца арыентырам для дзейнасці, а на наступных — нацэльваюць школьнікаў на распрацоўку сістэмы пытанняў (аб рэспандэнце і ўспрыманні ім мінулага), а таксама на іх дакладную і лаканічную фармулёўку.

У якасці прыкладу прывядзем фрагменты апытальнікаў, якія выкарыстоўваліся падчас збору вусных гістарычных сведчанняў супрацоўнікамі Беларускага архіва вуснай гісторыі і кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ.

Фрагмент апытальніка па тэме "Акупацыя ў Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны"[17]:

1. Дзе Вы знаходзіліся ў час вайны?

2. Колькі гадоў Вам было на той перыяд?

3. Апішыце, калі ласка, паўсядзённае жыццё пад акупацыяй.

4. Якімі былі ўмовы жыцця: ежа, адзенне, бытавыя ўмовы?

5. Якімі былі адносіны паміж мясцовымі жыхарамі?

6. Што Вы можаце расказаць пра палітыку нацыстаў у адносінах да мясцовага насельніцтва?

7. Ці аказвалася Вам падчас вайны медыцынская дапамога?

8. Што было для Вас самым цяжкім падчас акупацыі?

9. Што дапамагло Вам выжыць?

Фрагмент апытальніка па тэме "Традыцыйная культура харчавання"[18]:

1. Якія стравы гатавалі з мукі? Як яны называліся?

2. Як пяклі хлеб? (Неабходна падрабязна запісаць тэхналогію прыгатавання.)

3. У чым замешвалі цеста для выпечкі хлеба? Як называлася ў Вашай мясцовасці гэтая пасудзіна? З чаго яе рабілі? Дзе яна захоўвалася ў хаце? Ці можна было яе пазычаць? У якіх абрадах і святах яна выкарыстоўвалася?

4. Хто пёк хлеб? У якім настроі пяклі?

5. Як замешвалі цеста? Як з цеста рабілі булкі? Як яны называліся?

6. На што клалі цеста, каб пасадзіць яго ў печ? Як гэтая прылада называлася? Дзе захоўвалася? Што падсцілалі на хлебную лапату?

7. Ці рабілі на першай булцы крыжык?

8. Як саджалі цеста ў печ? Ці мог хто-небудзь знаходзіцца ў гэты час на печы?

9. Чым прапальвалі (якімі дровамі) печ для выпечкі хлеба? Як яе вымяталі? Як правяралі яе гатоўнасць?

10. Колькі часу знаходзіўся хлеб у печы? Як правяралі, ці гатовы ўжо хлеб?

11. Як яго вымалі? Куды клалі?

12. Ці змочвалі верхнюю скарынку вадой? Для чаго гэта рабілі?

13. Дзе хлеб захоўваўся? У якім памяшканні?

14. Як ставіліся да хлеба? Якія забароны, звязаныя з хлебам, існавалі ў Вашай мясцовасці?

15. Ці выпякалі што-небудзь з рэшткаў цеста? Як гэта называлася? Каму часцей за ўсё яго аддавалі?

Важна абмеркаваць са школьнікамі правілы арганізацыі і правядзення інтэрв'ю, прапанаваць наступныя ***рэкамендацыі***[19]:

1. Дзе лепш праводзіць інтэрв'ю?

Месца правядзення інтэрв'ю павінна быць такім, каб рэспандэнт адчуваў сябе ў натуральных умовах (напрыклад, у яго дома). У асобных выпадках інтэрв'ю можа праводзіцца на працоўным месцы або на прагулцы.

2. Калі і як доўга праводзіць інтэрв'ю?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рэспандэнт сам вызначае зручны для яго час сустрэчы, абмеркаваць яго трэба загадзя. Звычайна інтэрв'ю працягваецца каля гадзіны, гутарка — каля дзвюх гадзін. Калі патрабуецца больш часу, то лепш сустрэцца з рэспандэнтам у другі раз, а не стамляць яго падчас аднаго візіту.

3. Якая паслядоўнасць пытанняў інтэрв'ю?

У пачатку інтэрв'ю варта задаваць пытанні больш агульнага характару, якія не выклікаюць супярэчнасцяў і здзіўлення ў суразмоўцы, атрымаць агульныя звесткі пра самаго рэспандэнта. На другім этапе можна высветліць нейкія дэталі, папрасіць інфарманта расказаць больш пра згаданыя тэмы. На трэцім этапе можна закрануць новыя або прапушчаныя апавядальнікам сюжэты.

4. Які дадатковы матэрыял варта выкарыстоўваць падчас інтэрв'ю?

У ходзе інтэрв'ю неабходна прыцягваць дадатковы наглядны матэрыял, які ўдакладняе мэты або аб'ект даследавання. Фатаграфіі з сямейнага архіва, пісьмы і дзённікі, дакументы, ордэны і медалі заўсёды паляпшаюць працэс успамінаў і даюць магчымасць ацаніць пачуты аповед з пункту гледжання яго гістарычнай дакладнасці ў ходзе супастаўлення вуснай інфармацыі з матэрыяламі крыніц іншага тыпу.

5. Як завяршыць інтэрв'ю?

У канцы інтэрв'ю абавязкова трэба падзякаваць рэспандэнту. Акрамя таго, неабходна, не адкладваючы, запісаць уласныя каментарыі з нагоды кантэксту інтэрв'ю, характару рэспандэнта, яго дадатковых заўваг (зробленых, напрыклад, пры выключаным дыктафоне). Праслухаўшы запіс, важна пераканацца ў тым, што атрыманыя ўсе базавыя звесткі аб інфарманце, неабходныя для выкарыстання вуснага сведчання як гістарычнай крыніцы: яго ўзрост, пол, хатні адрас, прафесія і інш.

Дадзеныя рэкамендацыі могуць быць абагуленыя ў выглядзе памятак[20].

Памятка
"Як паводзіць сябе падчас і пасля інтэрв'ю"

1. У час інтэрв'ю рэкамендуецца:

- прыходзіць своечасова, быць падрыхтаваным і ветлівым;
- пачаць размову лепш самаму і сказаць некалькі слоў пра сябе;
- не задаваць пытанні, на якія рэспандэнт ужо адказаў раней;
- уважліва слухаць, быць цярплівым, даваць рэспандэнту час для адказу, не спрачацца з ім і не выпраўляць яго адказы;
- задаваць удакладняючыя пытанні, выкарыстоўваць дадатковыя наглядныя матэрыялы (фатаграфіі і дакументы) па тэме інтэрв'ю;
- не забыцца падзякаваць рэспандэнту напрыканцы інтэрв'ю.

2. Пасля інтэрв'ю трэба:

- запісаць, не адкладваючы, уласныя каментарыі да кантэксту інтэрв'ю, характару інфарманта;
- праслухаць (прагледзець) запіс яшчэ раз, каб праверыць, якую інфармацыю вы атрымалі, а якой вам яшчэ не хапае.

Памятка
"Як фармуляваць пытанні інтэрв'ю"

1. Пытанні павінны быць простымі і дакладнымі.
2. Усе пытанні павінны адпавядаць тэме інтэрв'ю.
3. Немэтазгодна задаваць пытанні, якія прадугледжваюць адназначны адказ "так" або "не".
4. Калі адказ не ўтрымлівае поўнай інфармацыі, неабходна карэктна задаць дадатковае пытанне.
5. У пытанні неабходна ўключаць наступныя фразы: "Раскажыце мне, калі ласка, аб ...", "Што Вы думаеце наконт ...", "Ці можаце Вы апісаць ... (растлумачыць, больш падрабязна расказаць, абмеркаваць, параўнаць)" і г. д.
6. Падчас інтэрв'ю пажадана выкарыстоўваць дапаможныя сродкі (напрыклад, фатаграфіі, рэчы, газетныя выразкі і інш.).
7. Неабходна ўключаць у фармулёўку пытанняў заахвочвальныя выразы накшталт "Гэта цікава!" Ці ў больш прамой форме: "Як?", "Чаму няма!", "Хто гэта быў?" і г. д.
8. Прапаноўваючы пытанні, трэба праяўляць суперажыванне і цярплівасць да поглядаў суразмоўцы.
9. Па магчымасці трэба пазбягаць навадных пытанняў.

Другі, акрамя інтэрв'ю, спосаб збору вусных гістарычных сведчанняў — **гутарка**. Яна ўяўляе сабой нефармальнае інтэрв'ю або размову на загадзя вызначаную тэму. У час размовы неабходна звяртаць увагу ў першую чаргу на асаблівасці гаворкі рэспандэнта (інтанацыі, паўзы, агаворкі), невербальныя знакі зносін (міміка, жэсты).

Фіксацыя вусных сведчанняў праводзіцца ў форме аўдыё- або відэазапісу, а таксама пратаколу інтэрв'ю гутаркі. Аднаўленне размовы па памяці пасля правядзення інтэрв'ю або гутаркі з'яўляецца недапушчальным. Па-першае, няма гарантыі, што інтэрв'юер запомніў усё належным чынам і зможа аднавіць размову цалкам. Па-другое, будзе страчаная структура арыгінальнай мовы, а гэтая інфармацыя ўяўляе не меншую каштоўнасць, чым апавяданне інфарманта.

Да пачатку інтэрв'ю або гутаркі неабходна правесці папярэднюю работу з інфармантам: растлумачыць яму мэту і задачы даследавання, задаць патрэбны эмацыянальны фон расказам аб важнасці і каштоўнасці яго ўспамінаў. Апытальнік трэба скласці такім чынам, каб пытанні ўскосна "перакрывалі" адно аднаго і тым самым дазвалялі праверыць ступень шчырасці і аб'ектыўнасці апавядання. Падчас размовы задаваць не навадныя, а ўдакладняючыя пытанні. Пазбягаць навязвання рэспандэнту тых ці іншых ацэнак, але сачыць, каб кожны паведамлены ім факт быў зразумелы і растлумачаны.

Кожнае інтэрв'ю (гутарка) павінна мець *пашпарт інфарманта*. Звычайна ён уключае ў сябе прозвішча, імя і імя па бацьку інфарманта, дату і месца нараджэння, нацыянальнасць (па жадан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 2

Некаторыя інтэрнэт-рэсурсы па вуснай гісторыі

Назва партала, сайта	Электронны адрас
Беларускі архіў вуснай гісторыі	http://www.nashapamiac.org
Беларуска-германскі праект "Гістарычная майстэрня"	http://gwminsk.com
Электроннае перыядычнае выданне "Адкрыты тэкст"	http://www.opentextnn.ru
Электроннае перыядычнае выданне "Адкрыты тэкст", рубрыка "Сямейныя архівы"	http://www.opentextnn.ru/history
Навукова-адукацыйны цэнтр "Вусная гісторыя"	http://oral-history.ru/ru
Цэнтр вуснай гісторыі і этнаграфіі гістарычнага факультэта Алтайскай дзяржаўнай педагагічнай акадэміі	http://www.uni-altai.ru/history/nil/lik/lik_ethno
Цэнтр вуснай гісторыі Петразаводскага дзяржаўнага ўніверсітэта	http://oralhist.karelia.ru
"Я памятаю". Успаміны ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны	http://iremember.ru
Агульнадаступны сеткавы архіў фонду "Вусная гісторыя"	http://oralhistory.ru
Украінскі адукацыйны праект "Вусная гісторыя"	http://www.ustnayaistoriya.info
Калекцыя ўспамінаў сведкаў "Памяць народа", створаная прыватнымі асобамі, адукацыйнымі і дзяржаўнымі ўстановамі, некамерцыйнымі арганізацыямі ў Еўропе	http://www.pametnaroda.cz/page/index.title/oral-history-method?locale=ru_RU

Табліца 3

Знакі і сімвалы, якія выкарыстоўваюцца для транскрыпцыі вуснай гістарычнай крыніцы

Знак (сімвал)	Значэнне
..	кароткая паўза
[...]	доўгая паўза
...	абарванне слова ці сказа рэспандэнтам
(???)	тэкст незразумелы
(?)	няўпэўненая транскрыпцыя
[х]	перапынак па жаданні рэспандэнта або канец часткі запісу
[*тэкст*]	упісанне невербальных рухаў або каментараў да недаказанага тэксту
---	цяжкасці пры адказе
* (ці !)	асаблівы момант, які патрабуе ўдакладнення
↓	паніжэнне голасу
↑	павышэнне голасу
(смяецца), (плача) і г. д.	адзначэнне эмацыйнага фону
выдзяленне слова тлустым шрыфтам	інтанацыйны націск

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цэс стварэння пісьмовай формы запісанага з дапамогай аўдыётэхнікі тэксту, бо менавіта тэкст інтэрв'ю як крыніца з'яўляецца найбольш папулярным і зручным сродкам яго выкарыстання даследчыкамі. Транскрыбіраванне — гэта першы этап вывучэння вуснай крыніцы.

Улічваючы, што іншыя гісторыкі будуць карыстацца ў асноўным тэкстамі, пераведзенымі ў пісьмовую форму, а не аўдыёзапісамі, пры правядзенні транскрыбіравання неабходна дакладна перадаваць мову інфарманта, не падвяргаць тэкст граматычнаму рэдагаванню. Сэнсавыя фрагменты, паўзы, эмацыянальны фон павінны супадаць з тым, што на самай справе было праяўлена інфармантам падчас інтэрв'ю. Пры расшыфроўцы запісу і яго пераводзе з аўдыёносьбіта на паперу важна захаваць і перадаць інтанацыю, эмацыйны настрой рэспандэнта. Указваецца дата запісу, дата расшыфроўкі, хто рабіў запіс і расшыфроўку.

Паколькі вусная крыніца не можа быць адэкватна прачытаная без расшыфроўкі невербальнай інфармацыі, якая суправаджае выказванне, для мінімізацыі яе страты ў працэсе перакладу тэксту з аўдыё- і відэафарматаў у пісьмовы, для абазначэння хуткасці, тэмпу, танальнасці мовы, эмоцый апавядальніка, назіранняў інтэрв'юера выкарыстоўваюцца спецыяльныя *сімвалы транскрыбіравання*.

Адным з аспектаў па асваенні вучнямі прыёмаў расшыфроўкі вусных гістарычных крыніц можа быць тлумачэнне знакаў-сімвалаў, якія дапамагаюць пазначаць асаблівасці мовы і паводзінаў рэспандэнта падчас інтэрв'ю (гутаркі) *(гл. табліцу 3)*[24].

Прапаноўваецца наступны план дзеянняў, накіраваных на чытанне тэксту вуснай гістарычнай крыніцы з улікам вербальных і невербальных кампанентаў зносінаў[25]:

1. Расшыфроўка (транскрыбіраванне) аўдыё- і відэараду сведчання.

А) Расшыфроўка асаблівасцяў гаворкі інфарманта. У якой манеры інфармант вядзе апавяданне? (Хутка, павольна, запінаецца.) Аб чым сведчаць інтанацыі яго голасу? (Ён сур'ёзны або іранічны, паслаблены ці напружаны, упэўнены або сумняваецца ў адказах.)

Б) Расшыфроўка асаблівасцяў эмоцый інфарманта. Якія эмоцыі выклікаюць у інфарманта апісваемыя ім падзеі? Ці суправаджаецца выказванне смехам, усмешкай, слязьмі, трагізмам? Чым яны тлумачацца? Якім чынам яны суадносяцца з ацэнкай апісваемых падзей інфармантам?

2. Прачытанне фактычнай інфармацыі.

А) Работа з храналогіяй. Аб якіх падзеях ідзе размова? Калі і дзе яны адбыліся? Якая храналагічная паслядоўнасць апісваемых падзей?

Б) Работа з тэрміналогіяй. Якія тэрміны ўжываў апавядальнік? Што яны абазначаюць? Ці ўжываў інфармант словы, сінанімічныя дадзеным тэрмінам? Калі так, то якія?

В) Работа з фактамі. Якія скрытыя і відавочныя факты выяўляюцца ў сведчанні? У апавяданні інфарманта вызначыце факты, меркаванні і версіі. Зрабіце выснову аб тым, якія падзеі (факты) мелі для апавядальніка найбольшую значнасць. Якім чынам вы прыйшлі да такой высновы?

III. Каментаванне вусных гістарычных сведчанняў.

Каментаванне — "упісванне" вуснага сведчання ў гістарычны кантэкст і асабістую біяграфію рэспандэнта, у сістэму яго каштоўнасцяў, якія аказалі ўплыў на з'яўленне дадзенага сведчання. Паколькі гістарычная крыніца ствараецца самім даследчыкам, то маюцца вялікія магчымасці для атрымання неабходнай інфармацыі пра аўтара сведчання "з першых вуснаў", у тым ліку і пра яго каштоўнасныя ўяўленні.

Каментарый да вуснай гістарычнай крыніцы можа быць складзены па наступным плане[26]:

1. Упісванне зместу ў біяграфію рэспандэнта.

А) Вызначэнне аўтарства крыніцы. Хто з'яўляецца аўтарам сведчання? Дзе ён нарадзіўся? Дзе ён пражывае зараз? Апавядае пра падзеі, непасрэдным удзельнікам якіх быў, ці ён толькі назіраў за тым, што адбываецца?

Б) Выяўленне становішча інфарманта ў грамадстве. Якое сямейнае становішча інфарманта? Які яго сацыяльны статус? Якім чынам ён ацэньвае апісаныя падзеі (са станоўчага або з адмоўнага боку) і як гэта суадносіцца з яго сямейным ці сацыяльным статусам?

В) Выяўленне прафесійных якасцяў інфарманта. Якую адукацыю атрымаў інфармант? Хто ён па прафесіі? Дзе працуе цяпер? Ці адносяцца апісаныя ім падзеі да сферы яго прафесійных інтарэсаў?

Г) Выяўленне кола інтарэсаў інфарманта. Хто ён па веравызнанні? Ці знаходзіўся ён у якіх-небудзь партыйных, грамадскіх і іншых арганізацыях? Калі так, то ў якіх? Ці праяўляюцца яго ідэйныя, рэлігійныя або любыя іншыя перакананні ў манеры апісваць гістарычныя падзеі? Якім чынам? Ці тычылася дадзенае сведчанне тэм, блізкіх ці далёкіх ад яго інтарэсаў?

Д) Выяўленне наступстваў апісваемых падзей у жыцці інфарманта. Да якіх наступстваў у яго жыцці прывялі апісаныя ім падзеі? Ці адбіліся іх наступствы на яго асабістым жыцці? На падставе чаго вы робіце гэтую выснову?

2. Упісванне зместу ў гістарычны кантэкст.

А) Выяўленне афіцыйнага кантэксту эпохі. Пра падзеі якога гістарычнага перыяду расказвае апавядальнік? Якія афіцыйныя ідэалагічныя ўстаноўкі або грамадскія каштоўнасці дадзенага перыяду вам вядомыя? Ці знайшлі яны сваё адлюстраванне ў дадзеным сведчанні?

Б) Выяўленне грамадскай думкі эпохі. Ці ёсць, з вашага пункту гледжання, у сведчанні інфарманта прадузятасць, звязаная з пануючай грамадскай думкай пэўнага гістарычнага перыяду? Ці знайшлі вы агульныя тэндэнцыі ў апавяданнях некалькіх інфармантаў пра пэўны гістарычны перыяд, якія дазваляюць зрабіць выснову аб агульных поглядах людзей гэтай эпохі?

IV. Інтэрпрэтацыя вуснай гістарычнай крыніцы.

Апошнім этапам вывучэння вуснай гістарычнай крыніцы з'яўляецца **інтэрпрэтацыя яе зместу**. Яна мае на мэце пераасэнсаванне тэксту крыніцы з пазіцый уласнага разумення, пабудову навуковага гістарычнага апісання і тлумачэння (г. зн., рашэнне пастаўленай даследчай праблемы з апорай на вусную крыніцу).

Вусныя крыніцы выкарыстоўваюцца гісторыкамі для вывучэння як гістарычнай рэальнасці, так і яе рэпрэзентацый, суб'ектыўных вобразаў мінулага. У сувязі з гэтым у ходзе навучання гісторыі важна звяртаць увагу старшакласнікаў не толькі на факты, якія паведамляе аўтар сведчання, але і на яго меркаванні з нагоды тых ці іншых гістарычных падзей. Навучаючы інтэрпрэтацыі вусных гістарычных крыніц, можна прапанаваць вучням тры групы пытанняў[27].

1. Пытанні на рэканструкцыю мінулага.

У чым заключаецца сутнасць апісваемай інфармантам падзеі? Якімі былі матывы людзей, якія прымалі ў ёй непасрэдны ўдзел? Якое значэнне апісаных падзей для ўсёй краіны, рэгіёну, горада, асобнага чалавека?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дыне коб напалылася добрэ. На лопату клалы дубовы лыст, отрубами кроху посыпалы, о так і без лысту бувало пеклы, алэ на лысту то быў запах такі укусны. Капусны і дубовы, тоді запах такі буў. Круглыя былі булкі. У піч як саджалі — хрысцім. Первую булку хрысцілі. Дверы не можно стукаты, каб узняўся, коб ныхто не входыв на кроха, як вжэ сажаемо в піч. Ну кажуць, што як зрушваецца вроді хліб. Не знаю, чы это так було. (смяецца) [...] Потім хліб вынімалы, да на стол клалы. [...] Сэм'і большыя булы, то хутко він і з'ядаўся, не було што заховаты, так він лежав і нэ портывся. Стараліса, як дэ крышачка якая бы не ўпала!" (Запісана ад Стасевіч Любові Арсенцьеўны, 1932 г. н., 04.07.2009 г.)"[29].

2. Магчыма *навучанне прыёмам работы з вуснымі крыніцамі ў працэсе падрыхтоўкі вучнямі даследчых работ да навукова-практычных канферэнцый.* У гэтым выпадку пры складанні індывідуальнай праграмы даследчыцкай дзейнасці прадугледжваецца навучанне вучняў тым прыёмам работы з вуснымі крыніцамі, якія неабходныя для вырашэння задач канкрэтнага даследавання. Вартасцю такога варыянта работы з'яўляецца цесная сувязь засваення ведаў пра спосабы стварэння і вывучэння вусных крыніц з іх ужываннем у практычнай дзейнасці. Разам з тым асвоеныя прыёмы работы з імі нярэдка ўспрымаюцца школьнікамі як неабходныя менавіта для дадзенага канкрэтнага даследавання, а не як абагульненыя спосабы дзейнасці з вуснымі крыніцамі.

3. *Арганізацыя работы з вуснымі крыніцамі ў старшых класах на профільным узроўні вывучэння гісторыі* дазваляе вырашаць задачы навучання прадмету, якія выходзяць за межы прыватнай задачы фарміравання ўменняў ствараць і вывучаць вусныя гістарычныя крыніцы. На гэтым узроўні прадстаўляецца магчымым у значнай ступені выкарыстаць навучальны, развіваючы і выхаваўчы патэнцыял стварэння і вывучэння вусных гістарычных крыніц.

Так, ***навучальны патэнцыял*** такой работы палягае ў канкрэтызацыі і паглыбленні ведаў школьнікаў па айчыннай гісторыі XX — пачатку XXI ст. па такіх накірунках, як:

- асабістая, калектыўная і "вялікая" гісторыя, гістарычная штодзённасць; суб'ектыўны свет людзей (іх каштоўнасці, традыцыі, стэрэатыпы, страхі, надзеі); індывідуальныя і лакальныя вобразы і інтэрпрэтацыі гістарычных падзей;

- фарміраванне элементаў гісторыка-метадалагічных ведаў вучняў (пра гісторыю як навуку, аб гістарычных крыніцах розных тыпаў, аб метадах гістарычнага даследавання, асноўных метадалагічных прынцыпах сучаснай гістарычнай навукі, аб адносінах гістарычных ведаў).

У аспекце фарміравання ***спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці*** вучняў зварот да вусных крыніц дазваляе:

- развіваць камунікатыўныя ўменні;

- фарміраваць у школьнікаў гістарычную эмпатыю;

- абмяркоўваць з вучнямі актуальныя праблемы гістарычнага пазнання;

- удасканальваць уменні работы з пісьмовымі і выяўленчымі гістарычнымі крыніцамі;

- суадносіць інфармацыю вусных крыніц са звесткамі, атрыманымі з іншых гістарычных крыніц, і рабіць высновы аб яе аб'ектыўнасці і паўнаце.

Выхаваўчы патэнцыял работы з вуснымі гістарычнымі крыніцамі заключаецца:

- у стварэнні ўмоваў для ўспрымання школьнікамі сучаснага полікультурнага свету;

- у развіцці талерантнага стаўлення да людзей (перш за ўсё да сваіх бацькоў, а таксама прадстаўнікоў старэйшага пакалення, людзей розных прафесій, нацыянальнасцяў);

- у актуалізацыі і ўзбагачэнні асабістага сацыяльнага вопыту вучня як удзельніка камунікацыі пры зносінах з відавочцамі і ўдзельнікамі гістарычных падзеяў.

Такім чынам, авалоданне вучэбнымі прыёмамі работы з дадзеным тыпам крыніц дазволіць старшакласнікам убачыць гісторыю не толькі як пэўную карціну мінулага, але і як вынік мэтанакіраванай дзейнасці людзей. Дакументы, якія знаходзяцца ў архівах, рана ці позна будуць знойдзеныя і ўведзеныя ў навуковы зварот, але калі мы не зафіксуем успаміны людзей старэйшага пакалення, іх гісторыя можа быць страчаная назаўсёды. Кожная з гэтых гісторый унікальная, як унікальнае і непаўторнае жыццё кожнага чалавека. Інтэрв'ю да таго ж з'яўляецца метадам выяўлення фотаздымкаў, дакументаў і пісьмовых крыніц у сямейных архівах, якія немагчыма выявіць іншым шляхам.

Вусныя гістарычныя сведчанні сучаснікаў і ўдзельнікаў падзей ёсць "жывая гісторыя", гістарычная памяць народа, якая дазваляе захоўваць сваю ідэнтычнасць. Яны з'яўляюцца каштоўным матэрыялам для падрыхтоўкі і напісання вучнёўскіх навукова-даследчых работ па гісторыі Беларусі і краязнаўстве, важнай крыніцай папаўнення фондаў школьных музеяў. Выхад школьнікаў за рамкі вучэбнага тэксту і работа з вуснымі гістарычнымі крыніцамі дае магчымасць сустрэцца са штодзённай гістарычнай свядомасцю і паразважаць над яе суадносінамі і ўзаемадзеяннем са свядомасцю навуковай.

[1] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы // Преподавание истории и обществознания в школе. 2012, № 10. С. 30.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

[2] Репина Л.П., Зверева В.В., Парамонова М.Ю. История исторического знания: пособие для вузов. 2-е изд., стереотип. М., 2006. С. 33, 275; Савельева И.М., Полетаев А.В. История как знание о социальном мире // Социальная история: ежегодник, 2001/2002. М., 2004. С. 31.

[3] Пушкарев Л.Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории. М., 1975. С. 191.

[4] Ковальченко И.Д. Методы исторического исследования. 2-е изд., доп. М., 2003. С. 135.

[5] Шмидт С.О. Путь историка: избр. тр. по источниковедению и историографии. М., 1997. С. 86—89.

[6] Методология истории: учеб. пособие для студентов ВУЗов / А.Н.Нечухрин, В.Н.Сидорцов, О.М.Шутова и др. / под ред. А.Н.Алпеева и др. Мн., 1996. С. 85.

[7] Орлов И.Б. Советская повседневность: исторический и социологический аспекты становления. М., 2010.

[8] Томпсон П. Устная история. Голос прошлого. М., 2003; Вансина Я. Устная история и устная традиция // Хрестоматия по устной истории / Сост. М.Лоскутова. СПб., 2003. С. 66—109; Портелли А. Особенности устной истории // Там жа. С. 32—51.

[9] Томпсон П. Устная история. Голос прошлого. С. 20.

[10] Шмидт С.О. Путь историка. С. 126.

[11] Васюк Г.В. Перспективы устной истории в Республике Беларусь // Развитие методологических исследований и подготовки кадров историков в Республике Беларусь, Российской Федерации и Республике Польша: сб. науч. ст. / под научн. ред. А.Н.Нечухрина. Гродно, 2012. С. 140, 142; Багдановіч І.І. Вусныя гістарычныя крыніцы ў навучанні гісторыі // Актуальныя праблемы айчыннай і сусветнай гісторыі: зб. навук. прац; рэдкал. М.М.Забаўскі, А.П.Жытко, Г.А.Космач і інш. Мн., 2013. С. 201—205.

[12] Лебдушка Л. Живая история. Метод устной истории в школе // Устная история: украинский образовательный проект [Электронны рэсурс]. 2014. Рэжым доступу: http://www. ustnayaistoriya.info/wp-content/uploads/2014/01/oral-history_brochure_fin.pdf.

[13] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы. С. 32.

[14] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы. С. 32; Раманава І. Уводзіны ў вусную гісторыю // Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс]. 2011—2013. Рэжым доступу: http://www.nashapamiac.org/docs/BAVH%20-%20Uvodziny%20w%20vusnuju %20historyju.%20I.%20Ramanava.pdf.

[15] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы. С. 31.

[16] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы // Преподавание истории и обществознания в школе. 2013, № 1. С. 17.

[17] Белановіч А. Метад "Вусная гісторыя": асноўныя падыходы і рэкамендацыі для правядзення інтэрв'ю // Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс]. 2011—2013. Рэжым доступу: http://www.nashapamiac.org/docs/BAVH%20-%20Oral%20History.%20A.%20Bielanovicz.pdf.

[18] Навагродскі Т.А., Алюніна І.У., Захаркевіч С.А. Народная кухня маталян. Мн., 2009. С. 88.

[19] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы // Преподавание истории и обществознания в школе. 2013, № 1. С. 19.

[20] Томпсон П. Устная история. Голос прошлого. С. 237-238.

[21] Раманава І. Уводзіны ў вусную гісторыю.

[22] Белановіч А. Метад "Вусная гісторыя": асноўныя падыходы і рэкамендацыі для правядзення інтэрв'ю.

[23] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы // Преподавание истории и обществознания в школе. № 1. С. 20.

[24] Там жа. С. 21; Белановіч А. Метад "Вусная гісторыя": асноўныя падыходы і рэкамендацыі для правядзення інтэрв'ю.

[25] Хлытина О.М., Лейбова Е.К. Устные исторические источники в учебном историческом познании на старшей ступени школы // Преподавание истории и обществознания в школе. № 1. С. 21.

[26] Там жа. С. 22.

[27] Там жа.

[28] Там жа. С. 22-23.

[29] Навагродскі Т.А., Алюніна І.У., Захаркевіч С.А. Народная кухня маталян. С. 11.

РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ